# НАШ ГОЛАС



Выпуск № 6

*Газета для вучняў, настаўнікаў і бацькоў*



## *У гэтым нумары:*

- ВЫНІКІ III ЧВЭРЦІ;
- НАШЫ ДАСЯГНЕННІ;
- ПАДЗЕІ МІНУЛАГА МЕСЯЦА;
- ШТО СВЯТКУЮЦЬ У КРАСАВІКУ;
- ДА ЎВАГІ

# ВЫНІКІ ІІІ ЧВЭРЦІ

Вось і прайшла ІІІ чвэрць і пачалася IV, але хацелася б звярнуць увагу на вынікі ІІІ чвэрці. На працягу ўсёй чвэрці, а гэта амаль што тры месяцы, вучні разам з настаўнікамі вельмі шмат працавалі. У кагосьці вынікі лепшыя, а ў каго і горшыя. Нягледзячы ні на што мінулая чвэрць была напоўнена мерапрыемствамі, конкурсамі (як вучэбнымі, так і выхаваўчымі).

Па выніках ІІІ чвэрці якасць ведаў па школе склала 80%, а сярэдні бал 7,53. На высокім узроўні якасць ведаў па выніках чвэрці ў 4 класе (92%), у 11 класе (90%), у 8 класе (88%). На дастатковым – у 3 класе (84%), у 6 класе (82%). На дапушчальным – у 5 класе (72%), у 7 класе (71%), у 10 класе (71%), у 9 класе (60%).

Па выніках ІІІ чвэрці ў нашай школе 10 выдатнікаў.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| <br>**Гаўрылюк Алёна, 3 клас** | <br>**Навагран Аляксандр, 3 клас** | <br>**Скерсь Святлана, 3 клас** | <br>**Стацэвіч Станіслаў, 3 клас** | <br>**Копаць Ганна, 4 клас** |
| <br>**Мілюшкевіч Антоній, 4 клас** | <br>**Мамедава Рэната, 5 клас** | <br>**Гаўрылюк Анастасія, 6 клас** | <br>**Пішчык Караліна, 10 клас** | <br>**Заліпа Кацярына, 11 клас** |

# НАШЫ ДАСЯГНЕННІ



03.03.2015г. каманды дзяўчынак і хлопчыкаў прымалі ўдзел у спаборніцтвах па валейболу, якія адбыліся на базе Ёдкаўскай сярэдняй школы. Па выніках шэрагу гульняў нашы каманды занялі III месца.

---

14.03.2014г. адбыліся раённыя спаборніцтвы па рухомых гульнях "Вас выклікае Спартландыя", у якіх прымала ўдзел каманда нашай школы ў складзе 20 чалавек. Нашы хлопчыкі і дзяўчынкі імкнуліся да перамогі і прыклалі ўсе намаганні, каб атрымаць прызавое месца. Па выніках спаборніцтваў каманда школы заняла III месца.



---



Падчас вясенніх канікул вучні нашай школы прымалі ўдзел у раённай алімпіядзе сярод вучняў I і II ступеняў навучання. Прадстаўнікі школы удзельнічалі ў аліпіядзе па матэматыцы (Талдыкоў А.), па беларускай мове (Мілюшкевіч А., Копаць Г., Навагран Т., Мамедава Р., Гаўрылюк А.), па англійскай мове (Навасад Я.), па гісторыі (Пятрушка Д.), па біялогіі (Стацэвіч Л.), па працоўнаму навучанню (Фёдарава М.)



Вынікі:

**Мілюшкевіч Антоній - I месца** па беларускай мове;
**Копаць Ганна - II месца** па беларускай мове;
**Навагран Таццяна - III месца** па беларускай мове і літаратуры.

**Віншуем пераможцаў!!!**

# ПАДЗЕІ МІНУЛАГА МЕСЯЦА



14.03.2015г. вучні 3 і 4 класаў адправіліся ў падарожжа на шклозавод "Неман" у г.Бярозаўку, наведалі там жа ЦДТ, затым адправіліся ў вёску Ганчары, дзе наведалі храм Пакрова Прасвятой Багародзіцы. На шклозаводзе для вучняў была арганізавана экскурсія, а таксама вучні атрымалі магчымасць набыць сувеніры.








---




16 сакавіка 2015 года ў рамках акцыі "Мы – грамадзяне Беларусі!" у зале пасяджэнняў Лідскага райвыканкама адбылося ўрачыстае ўручэнне пашпартоў лепшым вучням раёна. Галоўны дакумент грамадзяніна Рэспублікі Беларусь у гэты дзень атрымалі 18 юнакоў і дзяўчынак.

Сярод іх былі і нашы вучаніцы 8 класа Гур'ян Анастасія і Мусатава Надзея.

---



18 сакавіка 2015 года адбыўся агульнашкольны бацькоўскі сход "Інтэграцыя намаганняў сям'і, школы і грамадскасці ў духоўна-маральным выхаванні падлетка".

На сходзе прысутнічалі і выступілі ўрач-валеолаг ДУ "Лідскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі" Марыя Адольфаўна Паўлава і інспектар РАНС Яраслаў Станіслававіч Капачэль.







# ПАДЗЕІ МІНУЛАГА МЕСЯЦА



26 сакавіка 2015 года падчас канікул вучні 7 класа разам з класным кіраўніком пабывалі ў сярэдняй школе №10 горада Ліды, дзе яны наведалі музей ваенных маракоў. Пасля наведвання музея, навучэнцы адправіліся ў кінатэатр "Юбілейны".







---

## "Тыдзень леса – 2015!"





З 28.03.2015г. па 04.04.2015г. на тэрыторыі нашай краіны праходзіў "Тыдзень лесу – 2015". Адкрыццё "Тыдня лесу – 2015" адбылося ў кв.70 Лідскага лясніцтва, дзе на пляцоўцы 15,0 га былі закладзены юбілейныя культуры, прысвечаныя 70-годдзю Перамогі.

У стварэнні юбілейных культур прынялі ўдзел прадстаўнікі Лідскага раённага выканаўчага камітэта, Лідскай раённага Савета дэпутатаў, навучэнцы Мінойтаўскай і Тарноўскай сярэдніх школ, прадстаўнікі Лідскіх электрасетак і інспекцыі па ахове жывёлы і расліннага свету.



---



Канікулы – гэта пара, калі можна адпачыць не толькі вучням, але і настаўнікам. Вось і нашы настаўнікі скарысталі такую магчымасць і адправіліся ў сталіцу нашай краіны, дзе наведалі Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь. У тэатры педагогі наведалі оперу "Евгений Онегин".







# ШТО СВЯТКУЮЦЬ У КРАСАВІКУ

## 1 красавіка - Дзень смеху



Дзень смеху - міжнароднае свята, якое адзначаецца ва ўсім свеце 1 красавіка. У гэты дзень прынята разгульваць родных, сяброў і проста знаёмых, або паджартоўваць над імі.

## 2 красавіка - Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі



Штогод 2 красавіка адзначаецца Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі. У гэты дзень у 1997 г. быў падпісаны Дагавор аб Саюзе Беларусі і Расіі. У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 157 ад 26.03.1998 Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі з'яўляецца дзяржаўным святам, але працоўным днём.

## 12 красавіка - Дзень авіяцыі і касманаўтыкі



Гэта асаблівы дзень — дзень трыўмфу навукі і ўсіх тых, хто сёння працуе ў касмічнай галіне. Як свята - Дзень касманаўтыкі - ён быў усталяваны Ўказам Прэзідыўма Вярхоўнага Савета СССР ад 9 красавіка 1962 года, а міжнародны статут атрымаў у 1968 годзе на канферэнцыі Міжнароднай авіяцыйнай федэрацыі.

## 24 красавіка – Міжнародны дзень салідарнасці моладзі

Міжнародны дзень салідарнасці моладзі адзначаецца штогод з 1957 года. Гэты памятны дзень служыць яшчэ адной падставай, каб прыцягнуць увагу дзяржаўных органаў, грамадства і сродкаў масавай інфармацыі да праблем моладзі.





**Пасха** - гэта адно з самых доўгачаканых і галоўных свят у жыцці верніка. Самае істотнае адрозненне свята ў католікаў і праваслаўных – гэта велікодны трус. У каталікоў на святочным стале абавязкова павінен быць ядомы або цацачны трус. Карані гэтай традыцыі сыходзяць у старажытнасць, Любімая забава для каталіцкіх дзяцей на Вялікдзень – гэта адшукаць велікодныя яйкі. Бацькі хаваюць яйкі па кватэры або на ўчастку хаты, а дзеці іх шукаюць. Часам велікодныя яйкі хаваюць у велікоднага труса, маленькім дзецям кажуць, што менавіта трус прынёс святочныя пачастункі.Таксама, у каталікоў няма звычаю ў дзень Вялікадня вітаць адзін аднаго словамі «Хрыстос *Васкрэс*». Такая традыцыя цалкам застаецца праваслаўнай.

# ДА ЎВАГІ



## Конкурс ваенна-патрыятычнай песні і конкурс чытальнікаў вершаў

Адбудзецца 8 мая!

---

## Спосабы здымання стрэсу

1. Вітамінатэрапія.Стрэсавы стан прымушае чалавечы арганізм уключаць усе ўнутраныя рэзервы, каб падтрымаць яго працаздольнасць ужывайце ў ежу карысныя прадукты, насычаныя вітамінамі С (яблыкі, памідоры, шыпшыннік) і В (сухафрукты, капуста, бурак, міндаль, курыная печань, рыба і г.д.)
2. Яшчэ адзін метад здымання стрэсу - ўжыванне ў ежу прадуктаў, спрыяльных паляпшэнню настрою. Як вядома, дапамае ў барацьбе са стрэсам гармон шчасця - сератанін, а такія прадукты, як бананы, міндаль, шакалад і шматлікія іншыя спрыяюць яго выпрацоўцы. Але не ўсе прадукты дапамогуць у барацьбе са стрэсам, абмяжуйце ўжыванне цукру, кафеіну і жырнай ежы па меры магчымасці.
3. Араматэрапія. Яшчэ з старажытных часоў вядома добрае ўздзеянне духмяных эфірных алеяў. Заспакаяльна дзейнічаюць эфірныя алеі ружы, лаванды, язміна і кіпарыса.
4. Шчырая гутарка, як спосаб здымання стрэсу вельмі эфектыўная.
5. Займіцеся спортам.
6. Найстаражытная сістэма - ёга.
7. Часцей усміхайцеся. Калі ўсміхацца часцей, то можна выклікаць добры настрой на падсвядомым узроўні.


| | | | |
|---|---|---|---|
| **НАШ ГОЛАС**<br>*Газета для вучняў, настаўнікаў і бацькоў* | **Заснавальнік –** Мінойтаўская СШ<br>**Галоўны рэдактар –** Хіневіч Н.М. | **Афармленне:**<br>Савет старшакласнікаў | **Адрас рэдакцыі:**<br>в.Мінойты, вул.Чырвонаармейская, 3, тэл. 597337 |